

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№8(124)

15 красавіка 2014 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

КАМІТЭТ ДЗЯРЖКАНТРОЛЮ: Мадэрнізацыя АПК у Магілёўскай вобласці пакуль не прыносіць належнага эфекту

Мадэрнізацыя аграпрамысловага комплексу ў Магілёўскай вобласці пакуль не прыносіць належнага эффекту, перадае БелТА.

Такое меркаванне выказаў на калегіі Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці ў ходзе разгляду выканання ў рэгіёне мерапрыемстваў Рэспубліканскай праграмы развіцця малочнай галіны начальнік упраўлення Вячаслаў Асмалоўскі.

Калегіяй адзначана, што Магілёўскі аблвыканкам і райвыканкамы ў 2012—2013 гадах прымалі арганізацыйна-практычныя меры па далейшым развіцці галін вытворчасці і перапрацоўкі малака. Разам з тым іх нельга прызнаць дастатковымі. Цягам двух апошніх гадоў у вобласці не выконваюцца заданні па вытворчасці малака, росту пагалоўя дойнага статка, удоях. Больш за тое, у 2013 годзе гэтыя паказчыкі былі яшчэ і зніжаныя ў параўнанні з дасягнутымі ў 2012-м.

Пакуль не прыносіць належнага эфекту мадэрнізацыя аграпрамысловага комплексу. На кожнай з 21 ферм, пабудаваных у вобласці паводле ўказу №332, па-ранейшаму не забяспечваецца прадугледжаны іх праектамі надой малака ў памеры 7 тыс. кг у год. Да прыкладу, у 2013 годзе пры сярэднеабласным паказчыку ўдояў у 4187 кг на такой ферме ў Краснапольскім раёне яны склалі толькі 2025 кг, у Шклоўскім — 2200 кг, у Крычаўскім — 2607 кг.

На думку спецыялістаў, прычынамі гэтага сталі нізкая культура зааветэрынарнага абслугоўвання, невыкананне сельгасарганізацыямі тэхрэгламентаў па ўтрыманні малочнага статка, парушэнні тэхналогіі і прыпіскі нарыхтоўкі кармоў і інш. Да прыкладу, у мінулым годзе маштабныя прыпіскі аб'ёмаў нарыхтоўкі кармоў былі выяўленыя ў шэрагу гаспадарак Бабруйскага, Быхаўскага, Краснапольскага і іншых раёнаў. Пры гэтым асобнымі з іх справаздачныя дадзеныя аб аб'ёмах нарыхтоўкі кармоў былі завышаныя больш чым у 2 разы.

Не дала жаданага эфекту і праведзеная ў рамках праграмы камп'ютарызацыя кіравання статкам і заатэхнічнага ўліку. У трацiны сельгасарганізацый праз недахоп кваліфікаваных спецыялістаў дарагое абсталяванне і праграмнае забеспячэнне папросту прастойвае, усе іх функцыі па аптымізацыі заатэхнічных і ветэрынарных мерапрыемстваў не задзейнічаныя. Больш за тое, у асобных гаспадарках заатэхнічны ўлік належна не вядзецца нават традыцыйным «папяровым» спосабам, што цягне страты малака і прыплоду. У выніку такіх недахопаў, да прыкладу, у СВК «Следзюкі» Быхаўскага раёна ў гэтым годзе будзе недаатрымана каля 70 цялятаў і каля 110 т малака (больш 400 млн. руб.), у СВК



«Даманы» Дрыбінскага раёна — каля 40 галоў і 80 т малака (больш за 300 млн. руб.), у ААТ «Краснапольскі» — 25 галоў і 40 т малака (больш за 160 млн. руб.).

У ТЭМУ:

Як паведамляе БелаПАН, галоўнага заатэхніка калгаса імя Дзяржынскага ў Бабруйскім раёне падазраюць у прыпісках малака. Паколькі план райвыканкама па вытворчасці малака не выконваўся, у мэтах кампенсацыі жанчына "ўтрымлівала грошы з заробкаў працаўнікоў, якія аддавала ў бухгалтэрыю як плату гэтых работнікаў за малако". Такім чынам, нібыта, выконваўся план па вытворчасці малака і галоўны заатэхнік "пазбягала дысцыплінарнай і матэрыяльнай адказнасці".

Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі выявілі "продаж" на працягу 2011-2013 гадоў больш за 70 тысяч літраў малака на суму звыш 38 мільёнаў рублёў. Падазраваная пагаджаецца з абвінавачаннямі, але ў следства ёсць падазрэнні, што яна не адна мае дачыненне да злачынства.

ОТЧЁТЫ РАЙИСПОЛКОМА — ЧИТАЕМ МЕЖДУ СТРОК

Александр ВЛАД

«Жить стало лучше, жить стало веселее!», — выразился в одном из выступлений 30-х годов Иосиф Сталин, когда всей стране было совсем не до веселья. Советское общество задыхалось от ужаса перед нескончаемыми репрессиями, а организатор и вдохновитель невиданного в мире террора балагурил с высоких трибун. Чисто субъективно его можно понять, ведь легко говорить любую ересь и глупость, когда знаешь, что тебе никто не смеет возразить. К счастью, сейчас иные времена, и есть возможность называть вещи своими именами. Итак, давайте обсудим нашу «весёлую» жизнь.

Ежегодно Климовичский райисполком и Климовичский районный Совет депутатов готовят отчёты о своей работе за истекший период. Попробуем показать на примере недавно опубликованного Отчёта (газета «Родная ніва» от 15 марта), как «лучше и веселее» жили климовчане в прошедшем 2013 году.

КАК ПРОИЗВОДИМ И ВЫРАЩИВАЕМ?

Акцентируем внимание наших читателей лишь на наиболее значимых фактах, прозвучавших в перечислении итогов минувшего года. Так, про достижения промышленности района сообщается: «В 2013 году предприятиями района произведено промышленной продукции на сумму 828,8 млрд. руб. в фактических отпускных ценах». Сама по себе эта цифра говорит немного. Более понятным положение в экономике становится после того, когда узнаёшь, что рентабельность продаж в промышленности за 2013 год составила 5%. Это мизер, работа на грани прозябания, медленное опускание на дно. Кстати, в 2012 году данный показатель составлял 7,2%.

А теперь вернёмся в самое начало прошедшего года. По состоянию на 1 января 2013 года запасы готовой продукции на складах промышленных организаций района оценивались в текущих ценах в 29,8 млрд. руб., или 52,7% среднемесячного объёма производства. Спустя год, на 1 января 2014 года, нереализованной продукции на складах было на 92 млрд руб., или 135,7% среднемесячного объёма производства. Очевидно, что работаем на склад, расходуя ресурсы и теряя прибыль.

О результатах работы сельскохозяйственных организаций в Отчёте сообщается следующее: “В течение 2013 года произведено мяса 6,4 тыс. тонн, молока 23,2 тыс. тонн, зерновых и зернобобовых культур, включая зерно кукурузы (в весе после доработки) 43,7 тыс. тонн, рапса 4,3 тыс. тонн». Что касается молока, то его произвели меньше на 3%, чем в 2012 году. А урожай-2013, даже с включённым в него зерном кукурузы, весомо не дотягивает до уборочной 2012 года. Тогда было намолочено почти 50 тыс. тонн зерна, а рапса заготовлено более 6 тыс. тонн.

СОЦИАЛКА МИНУСУЕТ

В 2013 году на финансирование отраслей социальной сферы направлено 160,8 млрд. руб., или 63,9% от всех расходов. Для сравнения — в 2012 году финансирование социальной сферы составляло 67% от всех расходов. Вроде бы всего несколько процентов, но это ощутимо сказалось на выделении средств соответствующим отраслям. В том числе, и конкретным людям, нуждающимся в государственной поддержке и заботе. К примеру, если в 2012 году государственная адресная социальная помощь была оказана 1941 жителю района на сумму 2572,2 млн. руб., то в 2013 году — лишь 400 жителям на сумму 391,8 млн. руб.

Также отметим, что согласно Отчёту численность получателей пенсий и пособий на 1 января 2014 года составила 7725 человек (29% от численности населения района), из них пенсионеров — более 7473 человек (28%). Получается, что нагрузка на трудоспособное население района достигла рекордных значений. Климовичский район и так не в состоянии обеспечивать проживающих здесь пожилых людей, что же тогда говорить про грядущую перспективу?! На фоне стремительно стареющего населения Климовщины настоящим абсурдом выглядит тот факт, что в районе функционирует молодёжная целевая площадка по обобщению передового опыта в области реализации молодёжной политики.



ЗАПОЗДАЛЫЕ ОБЕЩАНИЯ

Несколько лет назад в одном из предыдущих Отчётов Климовичского райисполкома и Климовичского районного Совета депутатов можно было прочитать: «2011 год станет важной вехой в экономическом развитии Беларуси, в дальнейшем повышении благосостояния населения, реализации главной стратегической задачи нового пятилетия — войти в число первых 50 стран мира с наивысшим индексом развития человеческого потенциала». И вот уже близится к завершению объявленное некогда пятилетие, а реализация главной стратегической задачи по-прежнему оставляет желать лучшего. Особенно у нас, в Климовичском районе.

За 2013 год средняя заработная плата по народному хозяйству района достигла 3,9 млн. руб. На 2014 год для райисполкома определены основные показатели прогноза социально-экономического развития района: номинальная начисленная среднемесячная заработная плата — 4,6 млн. руб. Но уже сейчас, в январе 2014 года, средняя зарплата в Беларуси составила 5,3 миллионов. Из этого сопоставления ясно, насколько Климовичский район отстаёт в своём развитии от других районов страны. Понятно, что и там хватает проблем, но в сравнении с остальными регионами климовчане уж точно не живут «лучше и веселее».

МЕСТНЫЕ ИНТРИГИ НА МЕСТНЫХ ВЫБОРАХ

Тимур НЕЗВАНОВ

Выборы в местные Советы депутатов состоялись, так что про «заветную дату» можно теперь не вспоминать следующие четыре года. Впрочем, как и про самих избранных депутатов.

Кстати, про «заветную дату» мы упомянули без всякой иронии. В климовичской районной газете «Родная ніва» именно так и писали: «Всё ближе заветная дата — день выборов…». Ещё немного и можно начать уверять читателей, что это самое важное событие в их жизни. Думается, журналистам районки не стоит забывать, что когда пафос становится казённым, он вызывает не воодушевление, а совсем противоположные чувства.

На этих выборах не обошлось без маленьких местных интриг. Закономерно ожидалось, что депутатами опять станут чиновники и всякого рода начальники. Так и вышло, у кандидатов «из народа» не было никаких шансов. Но в Климовичах в одном случае эта железная закономерность не сработала. В Молодёжном избирательном округе №7 соперничали между собой Николай Белко, директор ЛВЗ, и Сергей Хартник, инженер по охране труда ДУКП «Жилком». Трудно поверить, но генеральный директор самого известного на Климовщине предприятия не стал депутатом районного Совета. Объявлено, что Николай Белко получил в свою поддержку 140 голосов, а Сергей Хартник — 387. Ещё 105 избирателей проголосовали против всех.

Конечно, можно предположить, что глава Климовичского ликёро-водочного завода не пользуется такой популярностью как работник ДУКП «Жилком». Но, на наш взгляд, существует более объективное объяснение избирательного провала Николая Белко. Возможно, нынешний гендиректор ЛВЗ ждёт назначения на иную вышестоящую должность. Во всяком случае, о такой возможности усиленно говорили в заводском коллективе весь прошлый год. Если это так, то насколько логично выбирать депутатом райсовета человека, который спустя какое-то время уедет из района? Решали это, разумеется, не избиратели. Достоверна ли озвученная нами версия, покажет ближайшее развитие событий.

ЛЮБОПЫТСТВО С ОПАСНЫМИ ПОСЛЕДСТВИЯМИ

Елена ПОЛЯКОВА

В Климовичском районе из-за своей беспечности и любопытства ребёнок попал в реанимацию. Он чуть не отравился ядовитой жидкостью.

В один из тёплых мартовских дней в деревне Малышковичи Климовичского района несколько детей играли на улице. Один из мальчишек, ученик второго класса, нашёл банку с какой-то жидкостью. Решив определить жидкость по вкусу, мальчик отпил несколько глотков из найденной банки. Почти сразу ребёнок почувствовал сильное жжение во рту. Перепуганные сверстники позвали взрослых, которые доставили его в больницу для осмотра.

Медики обследовали мальчика и поставили диагноз «химический ожог ротовой полости и пищевода». Чтобы нейтрализовать опасные последствия ему сделали промывание желудка и детоксикационную терапию. После этого ребёнку пришлось двое суток провести в реанимации Климовичской центральной районной больницы под наблюдением врачей. Потом мальчика перевели в хирургическое отделение, где ещё несколько дней медперсонал наблюдал за его состоянием, чтобы убедиться в том, что его здоровью ничего не угрожает

По факту отравления ребёнка УВД Могилёвского облисполкома проводит проверку. Необходимо выяснить, как банка с отравляющей жидкостью попала на улицу и определить, что это был за яд.

НИ ФОКА, НИ МАГАЗИНА?

Михаил ПЕТРОВ

Как известно, строить в Климовичах ФОК (физкультурно-оздоровительный комплекс) начали ещё несколько лет назад, но после президентских выборов 2010 года все работы были прекращены. А сейчас продолжать строительство просто нецелесообразно, всё равно потом не окупится. Самое же интересное в этой ситуации то, что одна проблема потянула за собой другие.



Честно говоря, за ФОК обидно, он бы стал украшением города и гордостью климовчан. Его проект был подготовлен Институтом по комплексному проектированию объектов жилищно-гражданского назначения «Могилёвгражданпроект». Проект так и остался нереализованным, но отдельные последствия его разработки климовчане всё-таки ощутили. Дело в том, что в ходе воздвижения комплекса должны были снести близлежащие строения, в том числе продуктовый магазин «24 часа» по улице Болдина. Говорят, что за расчистку территории заплатили ещё в самом начале строительства. И теперь, хотя ФОК так и не поднялся выше фундамента, работы по сносу всё-таки намерены завершить. Дескать, выделенные в своё время средства пошли на оплату именно этих работ.

Получается, у местных жителей не будет ни ФОКа, ни магазина. Кстати, продуктовый магазин «24 часа» уже закрыли, видимо, решение о его сносе принято. А люди теперь вынуждены ходить за покупками в центр города или в район агроколледжа, что по расстоянию совсем не близко.

НА ПУТИ ИСПРАВЛЕНИЯ ВСЁ ПУТЁМ?

Елена ПОЛЯКОВА

В прошлом году в Климовичской районной газете появилась небольшая заметка «На путь исправления». В ней сообщалось о мероприятии «Альтернатива», которое прошло в РОВД для ранее судимых граждан района. Там им рассказали, что вести законопослушный образ жизни в их же интересах. С этим не поспоришь, но всё-таки о какой альтернативе идёт речь?

В настоящее время в Климовичах живут сотни людей, имевших когда-то проблемы с законом. В районке упоминалось про 308 лиц, состоящих на учёте в уголовно-исполнительной инспекции Климовичского РОВД. Милиция никогда о них не забывает, ведь чаще всего именно бывшие осужденные становятся причиной новых криминальных правонарушений. Чтобы представить остроту ситуации, сошлёмся на знающего человека и специалиста. Доктор юридических наук Иван Басецкий, много лет работавший заместителем начальника Академии МВД, может говорить на эту тему, опираясь на научные исследования. По его мнению, «рэсацыялізацыя, вяртанне да нармальнага жыцця былых злачынцаў — цяжкае пытанне» (газета «Звязда» - №41, 2013).

Доктор наук, профессор Басецкий привёл следующие факты: «Высокі працэнт рэцыдыўнай злачыннасці — асаблівасць нашай краіны. Сёння з дзесяці вызваленых з-за кратаў у лепшым выпадку двое не вернуцца туды зноў». Вместе с тем, учёный подчеркнул, что хоть это и «цяжкае пытанне, але ім абавязкова трэба займацца». Мы полностью согласны с таким мнением, но не уверены, что в современной Беларуси можно реализовать подобный подход к бывшим осужденным.

Безусловно, трудно поверить, что люди, побывавшие за решёткой, настойчиво стремятся вновь попасть в колонию или тюрьму. Почему же «з дзесяці вызваленых з-за кратаў у лепшым выпадку двое не вернуцца туды зноў»? Очевидно, что в Беларуси отсутствуют условия для возвращения таких людей к нормальной жизнедеятельности. И, в первую очередь, по экономическим причинам. Государство, которое не в состоянии обеспечить сносный уровень жизни для большинства членов общества, не будет специально стараться для тех, кто стал его изгоем.

Во время мероприятия «Альтернатива» заместитель председателя Климовичского райисполкома Екатерина Музыченко обратилась к ранее судимым гражданам: «Ваша главная задача теперь — вести законопослушный образ жизни, трудиться, создать нормальные семьи. Власть готова пойти навстречу и помочь в вопросах трудоустройства, обеспечения жилым помещением». Хорошие слова, но насколько они выполнимы? Если бы не было проблем, рецидивная преступность не приобрела бы такой размах. К тому же даже в цитируемой заметке отмечается, что «состав осужденных омолаживается». Поэтому необходимо признать, что хороших слов и благих намерений сегодня явно недостаточно.



"Кто из вас тут по обвинению в компьютерном взломе?"

В связи с этим можем указать на один из возможных способов, применяемых сейчас в Беларуси. Европейский Союз осуществляет в нашей стране проект «Интеграция бывших осужденных в общество». Проект реализуется при финансовой поддержке Евросоюза и технической поддержке Международной федерации обществ Красного креста и Красного полумесяца. Разумеется, всё проходит в тесном сотрудничестве с МВД Беларуси. На правовое консультирование, медицинское обследование и др. Евросоюз выделил 300 тыс. евро. Правда, деятельность проекта охватывает всего три белорусских колонии — ИУ открытого типа №43 (Могилёв), ИК №15 (Вейно, Могилёвский район), ИК №17 (Шклов). Тем не менее, это конкретный и важный шаг на том самом пути исправления, встать на который в нашей стране очень и очень непросто.

НОВОСТИ РЕГИОНА

А ТАК СТАРАЛИСЬ

За первый квартал текущего года в области собрано около 13 тыс. тонн всех видов вторичного сырья. По данным Управления ЖКХ облисполкома, это меньше, чем планировалось собрать. Если конкретно, то отходов картона и бумаги собрано 15% от годового задания, стекла — 13%, полимеров — 17%. Наихудшие результаты по заготовке вторсырья отмечены в пяти районах Могилёвщины, в том числе в Климовичском районе.

КАЛЯДНАЯ ВАНДРОЎКА Ў КЛІМАВІЧЫ

Ясь ГАСПАДАР

Адной з несумненных і найбольш карысных пераваг інтэрнэта ёсць тое, што ён дае магчымасць злучыць паміж сабой думкі, справы і зацікаўленасці людзей з усяго свету. Віртуальнае сеціва стварае ўмовы для непасрэдных кантактаў на любой адлегласці, далучае да індывідуальных аповядаў і ўражанняў усіх астатніх інтэрнэт-карыстальнікаў. Асабліва цікава, калі распавядаецца пра твой родны горад і можна па-іншаму ўбачыць, здаецца, даўно вядомыя будынкі, мясціны і краявіды.

Інжынер і пісьменнік Уладзімір Садоўскі з Маладзечна прыязджаў у Клімавічы яшчэ на пачатку зімы. Зусім нядаўна ён вырашыў падзяліцца ўспамінамі пра сваю вандроўку на Клімаўшчыну, зрабіць, так бы мовіць, “трохі запазда-лую справаздачу”:

“11-12 студзеня мы вялікай кампаніяй выбраліся пакалядаваць са сталіц на ўскраіну Беларусі, у госці да шырокавядомага ў вузкіх колах Аляксандра Галкоўскага. Райцэнтр Магілёўскай вобласці знаходзіцца ў 30 км ад мяжы з Расіяй. І гэта, я вам скажу, адчуваецца — дарогі у цэнтры горада "ні к чорту". Ночылі ў гэтым цудоўным "хостэле" - базе турыстаў - у нумары на 20 з лішнім коек:) База, як бачна, размешчана ў дарэвалюцыйным будынку ў цэнтры Клімавіч на вуліцы Савецкай.

Пасля таго, як калядоўшчыкі пакінулі рэчы на базе, Аляксандр арганізаваў нам аглядную экскурсію па горадзе. Мы рушылі ўздоўж вуліцы Савецкай у бок гістарычнага цэнтру. Універмаг савецкіх часоў. Па словах Аляксандра, тут размяшчалася першая ў горадзе крама з самаабслугоўваннем. Ашалелыя ад нечуванай свабоды ў галіне гандлю жыхары Клімавіч пачалі актыўна тырыць з паліц "нічэйнае" дабро, таму на першых парах уваход у краму ажыццяўляўся ў парадку жывой чаргі і не больш за аднаго чалавека за раз. Пакуль адзін з шчаслівых хадзіў з кошыкам сярод паліц з прадуктамі пад пільным наглядам прадавачак, астатнія пакупнікі маяліся за шэрагам кас. З часам пакупніцкая культура ў горадзе вырасла і ўсе хутка забыліся на гэты ганебны перыяд у гісторыі мясцовага гандлю.

Вуліца Савецкая вывела нас на безназоўную плошчу, дзе сканцэнтравана большая частка гістарычнай забудовы горада. У цэнтры "плошчы" — проста агромністы для такога горада, як Клімавічы, рэстаран. Усе прысутныя зацанілі арыгінальны дэкор будынка, выкананы з дрэнажных керамічных трубак. Апроч рэстарана тут месціцца бар і більярд. Але не рэстаранам адзіным жывыя Клімавічы, ёсць у горадзе месца і для духоўнай ежы — царква ў гонар архангела Міхаіла. Нашай экскурсійнай групе "пашчасціла" патрапіць на актыўную прадстаўніцу клімавіцкага праваслаўнага прыхода і праслухаць лекцыю на тэму паходжання анёлаў і дэманаў, а таксама паўдзельнічаць у майстар-класе па праваслаўнаму жагнанню. Каля царквы месціцца старажытны камень-крыж, прывезены з раёна.

Ад "гістарычнага цэнтру" мы рушылі ў не менш гістарычны цэнтральны парк. Гэты парк, разбіты ў канцы XVIII стагоддзя, добра бачны на аэрафотаздымках розных часоў. Глядзець у парку няма на што, апроч гэтага рэактыўнага знішчальніка СУ-9, пастаўленага тут за часамі прысутнасці ў клімавіцкім раёне базы ваенна-паветраных сіл. Вакол парка таксама размешчана некалькі гістарычных пабудоў. Рэдакцыя мясцовай газеты ў дарэвалюцыйным будынку, які пабудаваны на падмурках сярэднявечнага манастыра ў падвалах катарага нібыта захаронена бібліятэка Івана Жахлівага. Гарадскія легенды - яны такія:)

Тыповы пасляваенны дом культуры. Ленін у елках. Пра яго таксама расказалі гарадскую байку, пра тое, што ў Клімавічах быў іншы помнік правадыру, бронзавы і яго ў ліхія 90-я звезлі ў металалом. Новы прывезлі з вайсковай часткі ці аднекуль з раёна, не памятаю.

Ад парка пару крокаў да мясцовага краязнаўчага музея, дзе і працуе Аляксандр. Будынак — перліна драўлянага мадэрна канца XIX стагоддзя. Будынак знаходзіцца ў аварыйным стане, але музей працягвае працаваць - на рамонт няма грошай. У астатнім, у музеі ўсё класічна. Вайна прадстаўлена маштабнай дыярамай "Бой пад вёскай Мілаславічы 8 жніўня 1941 г.". Пытанне, што рабіў Т-34-85 у баі 1941-га года, пакінем на сумленні мастака. Дарэвалюцыйны перыяд росквіту горада замацаваны ў макеце пад умоўнай назвай "Клімавічы, якія мы страцілі". Народныя рамёствы і промыслы сімвалізуе загадкавая двуручная чарка. Сучасны стан гарадскога жыцця адлюстроўвае экспазіцыя з прадукцыяй мясцовага лікёра-гарэлачнага завода. Дарэчы, бальзамчык там нічагошны робяць, хаця, як кажуць мясцовыя, раней уся прадукцыя ЛГЗ была вышэйшага гатунку і трава была зелянее, і алкаголь спірцее.

На гэтым пункце нашая экскурсія закончылася і праз пару гадзін пачалося калядаванне, якое прайшло вельмі ўдачна. На развітанне, я хацеў бы падзяліцца аднім назіраннем. Заўважыў я ў Клімавічах адну цікавую рысу ў народнай архітэктуры горада — наяўнасць адасобленнага "прадбанніка" перад уваходам у хату. У нас на захадзе Беларусі так не робяць. Прынамсі, калі робяць, то не так масава і таму для мяне гэты выглядала дзіўна”.

P.S. З-за недахопу месца ўражанні Уладзіміра Садоўскага друкуюцца з некаторымі скарачэннямі. Прачытаць іх цалкам можа кожны, хто валодае інтэрнэтам, тым больш, што яны суправаджаюцца вялікай падборкай фатаграфій (yozas-gubka.livejournal.com). Дарэчы, што тычыцца байкі пра бронзавы помнік Леніну, які быццам бы трапіў на металалом. Па звестках дасведчаных людзей, усё так і было. Бронзавага Леніна ўсталявалі ў Клімавічах у 1964 годзе. А ўжо ў часы перабудовы замест яго з’явіўся іншы помнік. Кажуць, што прывезлі з расфармаванай ваеннай часткі ў Барсуках, каб клімавіцкім камуністам было куды несці кветкі на Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі.

НОВОСТИ РЕГИОНА

НЕ ПУСКАЮТ В ШКОЛЫ

В этом апреле еженедельник «Зямля і людзі» два номера подряд печатал материалы «круглого стола», на котором обсуждались злободневные кадровые проблемы белорусского АПК. На мероприятии присутствовала и выступала директор Климовичского аграрного колледжа Валентина Васильева. По её словам: «Ещё есть такая проблема — нас не пускают в школы, потому что им нужно обеспечить приём в свои лицеи. Так было в Костюковичах, так было в Хотимске, так было в Кричеве». О чём говорить, если из Кричевского района «у нас сейчас нет ни одного абитуриента».

ЛЕГЕНЧЕНКО ИВАН СЕРГЕЕВИЧ

Благодаря ему остались живы младенцы по всему миру

Михаил ПЕТРОВ

Иван Сергеевич Легенченко родился 27 января 1897 года в деревне Кривая Климовичского уезда. Без преувеличения можно сказать, что его рождение стало поистине знаменательным днём для всех тех, кто появлялся на свет в последующие годы. Ведь благодаря опыту, медицинским познаниям и научной интуиции нашего земляка новорожденные по всему миру получили самое драгоценное право — право на жизнь.



О юных годах Ивана Сергеевича почти ничего не известно. Можно лишь предположить, что простой сельский паренёк тянулся к образованию и имел неплохие задатки. В 1912 году он стал учащимся Могилёвской фельдшерско-акушерской школы, в которой провёл пять лет. После окончания был мобилизован в армию, но вскоре, в 1919-м, поступил на медицинский факультет Казанского университета.

Окончив университет, молодой врач три года работает ординатором акушерско-гинекологической клиники в далёкой Казани, а затем принимает решение перебраться поближе к родной Беларуси. После переезда трудится заведующим гинекологическим отделением Брянской губернской больницы. Но уже в 1926 году Иван Легенченко устраивается в акушерско-гинекологическую клинику Минска. Здесь закладывается начало его медицинской карьеры: ассистент, старший ассистент, доцент клиники, а также по совместительству главврач Центрального роддома столицы.

27 ноября 1933 года к уже хорошо известному в Минске врачу неожиданно приходят сотрудники госбезопасности. Ивана Сергеевича арестовывают по обвинению в участии в контрреволюционной подрывной организации. Полгода он провёл под следствием, а 26 мая 1934 года приговорён к 3 годам ссылки условно с отбыванием в Средней Азии. Доказательств его вины не было, но просто так на свободу репрессивные органы не выпускали. Только после смерти Сталина Иван Легенченко был полностью оправдан, 27 июля 1956 года его реабилитировала судебная коллегия Верховного суда БССР. Кстати, в архивах КГБ РБ до сих пор хранится его дело № 6743-с.

Понимая, что ссылка в Среднюю Азию лишит белорусское здравоохранение ценного специалиста, Ивану Сергеевичу разрешают остаться в Беларуси. С 1934 по 1941 год он заведует акушерско-гинекологическим отделением Могилёвской областной клинической больницы. Становится кандидатом медицинских наук. Но тут грянула война и врача Легенченко отправляют на фронт. Работает в госпиталях, потом назначен главным гинекологом 41-й армии и военного округа.

В послевоенное время занимается научной деятельностью, много лет был заведующим кафедрой акушерства и гинекологии Белорусского института усовершенствования врачей. С 1949 по 1963 гг. одновременно работал главным врачом Минского городского родильного дома. В 1947 г. Иван Сергеевич обосновал и внедрил в практику метод оживления мнимоумерших новорожденных, который вошёл во все руководства по акушерству и гинекологии как в СССР, так и за рубежом. Предложенный им метод позволил снизить смертность новорожденных, родившихся в состоянии асфиксии, с 20—25% до 2,8—4%, что позволило сохранить огромное множество жизней.

Достижения и заслуги И.С. Легенченко дважды отмечены орденами «Знак Почёта», а также званием «Заслуженный врач БССР». Умер 9 мая 1984 года, так что в этом году исполняется 30 лет со дня смерти нашего выдающегося земляка.

НОВОСТИ РЕГИОНА

В ЛЕС НА НЕДЕЛЮ

Добровольная акция «Неделя леса-2013» пройдёт на Могилёвщине с 20 по 27 апреля. Первоначально её объявили на более ранние сроки, но потом перенесли в связи со сложившимися погодными условиями. «Неделя леса» проводится Министерством лесного хозяйства с 2007 года. В этом году в ходе акции в целом по стране собираются посадить 30 млн. деревьев. Помочь в этом благородном деле призывает и ГЛХУ «Климовичский лесхоз», под охраной которого находится более 75 тысяч гектаров лесных массивов.

КНИГИ В ДАР

Климовичская центральная районная библиотека предлагает принять участие в благотворительной акции «Читатель дарит читателям». Объявлено, что все желающие могут принести в библиотеку самую различную литературу для организации выставки «Книги в дар читателям». Саму выставку запланировано открыть 15 сентября, а во время её проведения любому посетителю библиотеки можно будет выбрать понравившиеся книги.

ПОЎНЫ БАРДАК

Валер КАРБАЛЕВІЧ, Радыё Свабода

У чацвер Лукашэнка правёў нараду пра стан і перспектывы развіцця піваварнай галіны. І абурыўся, што дзяржаўнае прадпрыемства «Крыніца» дрэнна працуе і просіць у дзяржавы льготаў. У пятніцу кіраўнік Беларусі паехаў у Слуцк, наведаў ільнокамбінат і мясакамбінат. І зноў абурыўся. Апошнімі месяцамі Лукашэнка толькі і робіць, што абураецца станам эканомікі і дзяржпрадпрыемстваў. Прычым абурэнне нарастае ў арыфметычнай, калі не геаметрычнай прагрэсіі.



ПАСЛЯ ВАЙНЫ ТАКОГА НЕ БЫЛО!

«Поўны бардак, гаспадара няма, нікому гэта, адчуваю, не трэба... Гэта што такое? У нас пасля вайны такога не было!», — зрабіў выснову кіраўнік дзяржавы падчас наведвання льнокамбіната. Ён, мусіць, не здагадваецца, што паставіў дыягназ усёй эканоміцы краіны, існай сацыяльнай мадэлі, абвешчанай кампаніі мадэрнізацыі.

Дарэчы, пра апошнюю Лукашэнка ўзгадаў на льнозаводзе. «Далажыце, калі павінна быць скончана мадэрнізацыя, дзе новае абсталяванне. Можа, яно валяецца, як гэтыя трактары і сыравіна», — даручыў Лукашэнка старшыні КДК. Ён не ведае, але здагадваецца. Дзе ж яшчэ можа быць новае абсталяванне, як не валяцца!

Наведванне мясакамбінату ўвогуле скончылася тым, што ён загадаў прыпыніць яго працу, бо высветлілася, што тут перапрацоўваюць гнілое мяса. «Неадкладна ўдакладніце па краіне, ці ёсць такі бардак на нейкіх прадпрыемствах», — даручыў Аляксандр Лукашэнка. Пытанне рытарычнае. Думаю, адказ на яго ведае і сам беларускі лідэр. Калі падыходзіць з такім крытэрам, то трэба прыпыняць працу паловы прадпрыемстваў краіны.

Такім чынам, дыягназ пастаўлены. І з ім цяжка не пагадзіцца. З тым, што ў беларускай эканоміцы «поўны бардак», згодныя ўсе: улада і апазіцыя, беларускія і замежныя эксперты. Дый звычайныя абывацелі адчуваюць, што ў краіне «нешта не так».

ШТО Ж РАБІЦЬ?

Але што ж рабіць? Рэцэпты выздараўлення, выпісаныя Лукашэнкам, добра вядомыя.

**** Па-першае, загад навесці парадак:***

«Да 1 верасня тут усё павінна быць вылізана. Зрабіце нармальны льнозавод... За месяц навесці парадак!.. Да 1 жніўня павінен быць наведзены парадак на ўсіх прадпрыемствах... Улетку я на такія прадпрыемствы ездзіць не буду. Але калі з 1 жніўня я, не дай бог, зайду і мне нешта не спадабаецца — ведаеш, што будзе», — сказаў ён.

Тут, як звычайна, Лукашэнка пярэчыць сам сабе, дае супярэчлівыя загады. Дык парадак навесці за месяц, да 1 жніўня ці да 1 верасня? Як можна за 1–4 месяцы навесці парадак, калі гэтага не здолелі зрабіць за 20 гадоў?

**** Па-другое, дырэктарат перасадзіць у турму:***

«Распачынайце крымінальную справу і мне дакладвайце... Разбярыцеся ў рамках крымінальнай справы па ўсіх пытаннях... Усіх вінаватых — у камеру, няхай кампенсуюць шкоду».

Хоць метода не новая, але апошнім часам яна выкарыстоўваецца ўсё часцей. У дрэваапрацоўчай галіне ўжо некалькі начальнікаў сядзяць. Дапамагае ня вельмі.

Але турма — гэта не самае страшнае. На Слуцкім мясакамбінаце Лукашэнка прыдумаў новую, больш вытанчаную кару: закарміць начальнікаў гнілым мясам. «Усё, што сапсавана, хай ядуць. Калі пакінуць іх тут, нікога не выпускаць — няхай ядуць!» — загадаў ён.

**** Па-трэцяе, з'явіўся новы спосаб дэманстратыўнага прыніжэння наменклатуры — накіраваць высокага начальніка на даведзенае да ручкі прадпрыемства:***

Гэта было апрабавана яшчэ ў 2012 годзе падчас разборак у дрэваапрацоўчай галіне. І вось зноў. «З заўтрашняга дня накіраваць на прадпрыемства (Слуцкі льнозавод. — Аўт.) дырэктарам старшыню камітэту па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкаму», — загадаў Лукашэнка. «Не наведзяце — пойдзеце сюды працаваць (на Слуцкі мясакамбінат. — Аўт.), — сказаў ён, звяртаючыся да кіраўніка Мінскай вобласці Сямёна Шапіры. І дадаў, што гэта тычыцца і прэм'ер-міністра з ягонымі падначаленымі.

Чарговы спектакль для народу атрымаўся. Ягоны электарат можа быць задаволены, бо любіць, калі прэзідэнт ганяе мясцовых начальнікаў. Але эканамічнага сэнсу ўсё гэта не мае. «Поўны бардак» — гэта дыягназ, ганаровая грамата да 20-гадовага юбілею.

У ФРАНЦЫІ ПРАЦАДАЎЦАМ ЗАБАРАНІЛІ ТУРБАВАЦЬ ПАДНАЧАЛЕНЫХ ПАСЛЯ 18.00

Прафсаюзы і арганізацыі працадаўцаў Францыі заключылі пагадненне, якое забараняе працадаўцам турбаваць сваіх супрацоўнікаў пасля заканчэння працоўнага дня, паведамляецца на сайце nn.by

З гэтага часу работнікі кампаній могуць не адказваць на дзелавыя тэлефанаванні або электронныя паведамленні паза працоўным часам (да 9.00 і пасля 18.00). Больш за тое работнікам рэкамендавана выключаць рабочыя смартфоны пасля сыходу з офіса і не адчыняць электронную пошту. У выніку больш за мільён грамадзян Францыі, якія працуюць у кансалтынгу і іншых сферах, наўпрост звязаных са званкамі і перапіскай, цяпер пазбавяцца «лічбавага» працоўнага часу.

Згодна з заканадаўствам, у Францыі працоўны тыдзень абмежаваны 35 гадзінамі. Аднак за кошт смартфонаў і іншых мабільных прылад працадаўцы нярэдка спрабуюць вырашыць працоўныя пытанні са сваімі супрацоўнікамі ў вячэрні час або ў ранішні — да пачатку працоўнага дня. У выніку працягласць працоўнага тыдня набліжаецца да 40 гадзін.

Францыя вядомая строгім захаваннем працоўнага заканадаўства, дзе з 21.00 да 6.00 праца забаронена. Раней кампанія Apple ужо была аштрафаваная за тое, што прымушала працаваць сваіх супрацоўнікаў па начах.

Падобныя меры ўкараняюць буйныя кампаніі і ў іншых краінах. Напрыклад, нямецкі канцэрн Volkswagen наладзіў свае паштовыя серверы такім чынам, што супрацоўнікі не могуць атрымліваць дзелавую электронную пошту, калі да канца іх працоўнага дня засталося 30 хвілін.

СЫН ГЛАВЫ КУБИНСКОГО МВД СБЕЖАЛ В США

Хосуе Коломе Васкес, сын министра внутренних дел Кубы, сбежал в Соединенные Штаты и попросил там убежища.

Он бежал через Мексику, пересёк страну и добрался до границы с США. Сейчас сын кубинского министра находится в Майами у своей матери Сури Васкес Руис, бывшей супруги главы МВД Кубы.

То, что Коломе Васкес сбежал, доказывают и фотографии на его странице в Facebook. На снимках сын главы МВД изображен в нескольких местах Майами — на пляже, в спортивном зале, на улице на фоне чужого автомобиля, отмечает издание Майами CafйFuerte.

В последнее время сбегать в США стало популярным среди детей и близких родственников главных фигур в руководстве Кубы. В августе 2012 года Гленда Мурилло Диас, дочь министра экономики и планирования, переехала в Флориду. Пабло Эрнесто Ремирес де Эстенос Семидеи переехал в Майами. Его отец — бывший заместитель министра иностранных дел и глава дипломатической миссии Кубы в Вашингтоне с 1995 до 2001. Ещё один переселившийся в США — Алехандро Луис Барреиро Агрело, 25-летний сын бывшего начальника Управления разведки Кубы, прибыл в Майами в сентябре 2012 года.

МИНУТКА ЮМОРА

Сидят два мужика, выпивают. Один другого спрашивает:
- Слушай, а что такое логика?
- Ну, как тебе объяснить... Видишь — вон двое идут, один грязный, другой чистый. Какой из них в баню идёт?
- Наверно, грязный.
- Правильно. Он грязный, поэтому идёт мыться. Вот это называется логикой.
- А что такое диалектика?
- Чтобы ты понял, спрошу ещё раз. Так кто из них в баню идёт?
- Конечно, грязный.
- А вот и неправильно! Чистый. Грязный — он потому и грязный, что в баню никогда не ходит. Вот это называется диалектикой!
- Ну, а что же тогда философия?
- Спрашиваю опять, кто из них в баню идёт?
- А чёрт его знает...
- Вот!!! Это как раз философия!

Мужик пришёл в магазин купить перчатки и обращается к продавщице:
- Можно мне пару перчаток?
- Вам какие, вязаные или кожаные?
- Кожаные.
- Вам коричневые или чёрные?
- Коричневые.
- А они у вас будут сочетаться с вашей одеждой?
- Наверно.
- Не могли бы вы принести некоторые предметы вашей одежды, которую вы носите, и тогда мы сможем подобрать для вас точный цвет.

Другой мужик, который стоял рядом, шепчет первому:
- Слушай, иди ты лучше отсюда. Я им даже унитаз приносил, а туалетную бумагу они мне так и не продали.

У ПАЎНОЧНАЙ КАРЭІ МУЖЧЫНАМ ЗАГАДАЛІ СТРЫГЧЫСЯ ЯК КІМ ЧЭН ЫН

Такі ўказ выдаў урад Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі.

Як піша "Комсомольская правда" са спасылкай на The Korea Times, гэты закон прынялі на дзяржаўным узроўні каля двух тыдняў таму. Спачатку чыноўнікі вырашылі паспрабаваць, як будзе працаваць такі загад, і ўвялі яго толькі ў сталіцы краіны Пхеньяне. Цяпер жа правіла распаўсюдзілася на ўсю краіну.

Да гэтага паўночнакарэйскія мужчыны мелі права выбіраць з 10 відаў прычосак, ухваленых дзяржавай.

ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКА KAMUNIKAT.ORG: БОЛЬШ ЗА 13 000 БЕЛАРУСКІХ ВЫДАННЯЎ

Праект “Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org”, які рэалізуе Беларускае гістарычнае таварыства, існуе з 2000 году і арыентаваны на збор незалежных беларускіх выданняў. На сайце www.kamunikat.org можна знайсці кнігі, газеты, аўдыё і відэа. Усяго размешчана больш за 13 000 розных выданняў. А ў раздзеле “Перыёдыка” знаходзяцца ўсе нумары “Клімавіцкай Інфа-Панарамы” за 2012 і 2013 год.

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна